

# ЗЯМЛІ НАДЗЕЙНАЯ АПОРА

**Мастоўскі раён**

**Спецвыпуск да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці**

Час ідэй і рэалізацый

## СТАБІЛЬНАСЦЬ, ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА І КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

### Найперш варта ўдзяляць увагу людзям

**Менавіта так вызначыў складнікі поспеху свайго раёна яго кіраўнік Андрэй САНЬКО. На гэтай пасадзе Андрэй Антонавіч працуе толькі другі год, але праца кіраўніка для яго не новая. Доўгі час ён узначальваў адну з самых паспяховых сельгаспадарак раёна — закрытае акцыянернае таварыства «Гудзевічы». Напрацоўкі ў сферы АПК новы старшыня імкнецца ўвасобіць і ў раённым маштабе. У першую чаргу, робіць акцэнт на развіцці аграпрамысловага комплексу. Сваім бачаннем АПК Андрэй Санько падзяліўся ў інтэрв'ю «Звяздзе» напярэдадні прафесійнага свята працаўнікоў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

> **У гэты святочны дзень шчыра віншую ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай галіны.**
>
> *Дзякую за самаадданасць, грамадзянскую адказнасць і адданасць абранай справе ўсім, хто працуе адказна, добрасумленна, у напружаным штодзённым рэжыме.*
>
> *Асаблівыя словы ўдзячнасці выказваю ветэранам аграпрамысловага комплексу за сялянскую мудрасць, гатоўнасць дзяліцца вопытам, за шматлікія працоўныя дасягненні. Гэта вашай працай, дарагія ветэраны, створана тая аснова, якая дазваляе сёння развіваць вытворчасць на зямлі.*
>
> *Жадаю ўсім моцнага здароўя, міру, шчасця, дабрабыту, дастатку ў сем'ях, добрага надвор'я, высокіх ураджаяў і далейшых поспехаў у працы на карысць роднай Беларусі!*

**— Андрэй Антонавіч, Мастоўскі раён можна назваць сельскагаспадарчым?**

— Мастоўшчына — сапраўды аграпрамысловы раён з развітой інфраструктурай. У нас сем сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Флагманы нашага раёна — ЗАТ «Гудзевічы» і ААТ «Чарлёна». Асноўныя напрамкі дзейнасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў — раслінаводства і жывёлагадоўля. Сёлетні год можна назваць паспяховым у рабоце гэтых галін.

**— Абласныя «Дажынкі» на Гродзеншчыне звычайна прымяркоўваюцца да дня работнікаў сельскай гаспадаркі. Вы задаволены тым, як выглядаў раён на абласных «Дажынках», якія сёлета прайшлі ў Бераставіцы?**

— Усе, вядома, чакалі свята. Аграры добра спрацавалі і заслужылі, каб іх ушанавалі. Добры вынік паказаў і Мастоўскі раён. Па ўраджайнасці ў нас шостае месца ў вобласці сярод сямнаццаці раёнаў. Мы бачым, куды рухацца і над чым працаваць.

**— Я ведаю, што свята хлебаробаў было прыемным і для вас асабіста...**

— Гэтыя «Дажынкі» былі асаблівыя. На фестывалі мне ўручылі медаль «За працоўныя заслугі». Указ быў падпісаны паўтара года таму, яшчэ падчас работы на пасадзе кіраўніка сельгаспадаркі. Але з-за хваробы тады не змог прысутнічаць на цырымоніі. Было вельмі прыемна атрымаць гэту ўзнагароду на такім агульным абласным форуме. Медаль уручыў Максім Рыжанкоў, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Для мяне гэта вялікі гонар. Прыемна, калі твая праца не застаецца без увагі.

**— Быць кіраўніком і гаспадаркі, і цяпер раёна — складаная місія і абавязак...**

— Работа няпростая. Працавітасць, дысцыпліна і прафесіяналізм, адказнасць і ўмела арганізаваная праца — усё гэта дасць станоўчы вынік. Але трэба ўлічваць і тое, што працуеш з людзьмі. Кіраўнік дзяржавы дае такі пасыл: «Не трэба крыўдзіць людзей». Толькі пры такім раскладзе можна гаварыць пра зладжанасць. Людзям трэба ўдзяляць больш увагі.

**— Кіраўнік краіны надае вялікае значэнне сельскай гаспадарцы. Як раён гэта адчувае?**

— Сапраўды, гэты сектар эканомікі Прэзідэнт заўсёды трымае ў полі зроку. Адным з самых маштабных праектаў лічу будаўніцтва сучасных жывёлагадоўчых комплексаў. Калі б мы гадоў дзесяць таму не пайшлі па гэтым шляху, не развівалі гэты кірунак, не мелі б і такой магутнай перапрацоўкі. Сёння беларуская перапрацоўка — на сусветным узроўні. Якасць нашай прадукцыі прызнана ўсюды. І беларускі рынак — на любы густ.

Калі пачаўся санкцыйны ціск, у раёне гэта таксама адчулі, бо мы завозім з Еўропы насенне кукурузы, цукровых буракоў, зерневых. Была некаторая рызыка, але паступова ўсё ўдалося ўладзіць. Пасяўная кампанія прайшла своечасова і ў поўным аб'ёме. Цяпер мы займаемся падрыхтоўкай да будучага года.

**— Дзяржава падтрымлівае сельгасвытворцаў?**

— Ідзе падтрымка ў плане набыцця паліва, мінеральных угнаенняў. Дзяржава дае аванс сельгаспрадпрыемствам. Пасля завяршэння ўборкі мы аддаём гэтыя сродкі, якія атрымалі авансам напярэдадні пасяўной. Да новага года мы павінны разлічыцца з дзяржавай.

Ёсць датацыі на вытворчасць прадукцыі. Для сельскай гаспадаркі характэрна сезоннасць, гэта не той канвеер, які стабільна працуе. Дзяржава дапамагае ўрэгуляваць затраты, каб яны не назапашваліся ў адным месцы. Добра працуюць лізінгавыя напрамкі, што дазваляе зрабіць закупку тэхнікі.

**— Наколькі поспехі ў вытворчасці сельскай гаспадаркі можна звязаць з тэмай адраджэння сяла?**

— Я ў сельскай гаспадарцы амаль 20 гадоў і бачу, як мяняецца сельская мясцовасць. Зрухі, безумоўна, ёсць. Яны звязаны з аспектам як вытворчым, так і з сацыяльным. У гаспадаркі прыходзяць тэхналагічнае абсталяванне, машыны. Будуюцца дамы і кватэры для работнікаў. Значны плюс многія работнікі бачаць у сацыяльным забеспячэнні, напрыклад, медыцынскае страхаванне. Вядома, тут таксама павінны быць нейкія ўмовы, напрыклад, стаж працы. Затое чалавек ведае, што ён зможа карыстацца платнымі медыцынскімі паслугамі, якія неабходна атрымаць. Гэта клопат кіраўніка, яшчэ — сацыяльныя пакеты. І гаспадаркі ідуць па гэтым шляху.

Між тым варта звярнуць увагу на праблему кадраў для сельскай гаспадаркі. Іх не хапае, хоць і зарплаты ў сельскай гаспадарцы пастаянна растуць.

**— Я ведаю, што ў вас ёсць свой падыход да вырашэння кадравай праблемы. Будзеце распаўсюджваць гэты вопыт?**

— Калі працаваў дырэктарам сельгаспрадпрыемства, часта бываў у мясцовай школе. Кіраўніцтва гаспадаркі цікавілася школьным жыццём, нам было важна, каб моладзь не пакідала малую радзіму. І зараз прадстаўнікі гаспадарак прысутнічаюць на школьных лінейках як на пачатку, так і ў канцы навучальнага года. Тых, хто прымаў удзел ва ўборачнай кампаніі, заахвочваюць прэміямі. Напрыканцы года выдатнікам вучобы, актывістам, спартсменам, удзельнікам алімпіяд таксама ўручаюцца грашовыя прэміі.

Важна дабіцца, каб у сельгаспрадпрыемствы раёна працаваць прыходзілі свае, мясцовыя. Для гэтага кіраўнікам трэба кантактаваць са школай, з сярэднімі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі сельскагаспадарчага профілю. Не проста зрабіць заяўку і чакаць, пакуль сюды прыедзе малады спецыяліст.

У раёне мы стварылі кадравую базу. На працягу пяці гадоў адсочваем сваіх выпускнікоў, куды яны паступілі. Гэта такая дапамога кіраўнікам, каб арыентавацца ў падборы кадраў. Яны бачаць, напрыклад, калі іх мастоўскі выпускнік завяршае вучобу. За год-два яму можна прапанаваць практыку, пазнаёміць з гаспадаркай. Тады ёсць верагоднасць, што будучы спецыяліст вернецца працаваць у свой раён.

Таксама мы робім стаўку на аграрныя класы. Гэты сегмент паціху раскручваецца. Зараз шчыльна займаемся гэтым кірункам. У раёне ў аграрных класах 37 чалавек. Лічу, што дзеці павінны знаёміцца з прадпрыемствамі раёна, каб зацікавіцца ў атрыманні накіравання для паступлення ў сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы.

**— У раёне працуе заслужаны работнік сельскай гаспадаркі фермер Генрых Мыслівец. Як раён узаемадзейнічае з ім і як наогул развіваецца ў раёне гэты сектар?**

— Гэта, на мой погляд, прагрэсіўны сектар. У Мастоўскім раёне зарэгістравана 22 фермерскія гаспадаркі. Нашы фермеры прымаюць удзел у семінарах, дзеляцца вопытам. Напэўна, няма ў Мастоўскім раёне таго чалавека, які б не ведаў Генрыха Валяр'янавіча Мысліўца, кіраўніка фермерскай гаспадаркі «Гарызонт», дэпутата Мастоўскага раённага і Гродзенскага абласнога Саветаў дэпутатаў, мецэната, сапраўднага чалавека ад зямлі — працавітага, шчодрага, па-сялянску мудрага і незвычайна сціплага.

Толькі сёлета ў нас было тры выязныя семінары ў фермерскую гаспадарку Генрыха Мысліўца. Нядаўна ён дзяліўся вопытам вырошчвання сланечніка: пакуль гэта новая культура ў раёне.

Зараз у яго амаль тры тысячы гектараў плошчы. Генрых Валяр'янавіч, разважаючы аб сакрэтах паспяховага фермерства, любіць гаварыць словамі Прэзідэнта, што ўсё залежыць ад нас саміх, самім трэба працаваць — тады і вынік будзе. Гэта яго прынцыповая пазіцыя, не раз пацверджаная жыццём.

Мы не супраць таго, каб перадаць землі фермерам. Галоўнае, каб яны не пуставалі, каб там не расло пустазелле. У цэлым фермеры нядрэнна працуюць, гэты сектар папаўняецца новымі фермерскімі гаспадаркамі. Я ўдзячны і фермерам, і кіраўнікам сельгаспадарак, якія імкнуцца развіваць свае прадпрыемствы, ісці наперад. Зараз час ідэй і іх рэалізацый. Мы можам самарэалізавацца на зямлі.




Фота Алены ДАЎЖАНОК.

## «РОБІМ СТАЎКУ НА АЗІМЫЯ КУЛЬТУРЫ»

**Раман РУБЛІК, першы намеснік старшыні — начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Мастоўскага райвыканкама:**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Сёлета ў раёне атрымана 55,6 ц/га зерневых, вал зерня з фермерскімі гаспадаркамі амаль 80 тысяч тон. Прыбаўка складае амаль 16 тысяч. Добрыя вынікі паказала пшаніца. Ураджайнасць гэтай культуры склала 64,5 ц/га.

Лідзіруе па ўраджайнасці ЗАТ «Гудзевічы». Тут з гектара сабралі 74,7 цэнтнера. На другім месцы — ААТ «Чарлёна», дзе гэты паказчык складае 63,1.

Парадаваў ураджай ячменю. Атрымалі з гектара 55,2 цэнтнера з улікам фермерскіх гаспадарак. Сабралі 15 тысяч тон рапсу і 21 тысячу тон кукурузы. Вынік нядрэнны.

У раёне 22 фермерскія гаспадаркі, з іх палова займаецца непасрэдна вырошчваннем сельскагаспадарчых культур.

Па нарыхтоўцы кармоў мы сутыкнуліся крыху з неспрыяльным надвор'ем. Значная частка кукурузы трапіла пад замаразкі. Яна падсохла, і мы не атрымалі той вал сіласу, на які спадзяваліся, хоць выйшлі на ўзровень мінулага года.

На трох прадпрыемствах арганізавана вытворчасць па аджыме алею насення рапсу. Жмых выкарыстоўваецца для кармлення статка. Плошчы пад пасевы гэтай маслічнай культуры пераглядаюцца. Таксама павялічыцца клін азімых зерневых культур. Будзе не менш чым 70 % сеяцца восенню. У цэлым атрымалі добры ўраджай. Сваю ролю адыгралі і насенне, і аднаўленне машынна-трактарнага парка.

Адной з асноўных і стабільных крыніц эканамічнага поспеху гаспадарак застаецца жывёлагадоўля. Аб'ём яе вытворчасці вырас на 9,4 %. Атрымана звыш 11 тысяч тон мяса і больш чым 59 тысяч тон малака. Сёлета створаны выдатныя перадумовы для павелічэння вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі ў перыяд зімоўкі жывёл. Нарыхтоўка кармоў на адну ўмоўную галаву — больш чым 42 цэнтнеры кармавых адзінак. Гэта 106,3 % да ўзроўню мінулага года.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

---

**Кожнае прадпрыемства ганарыцца ў першую чаргу сваімі вытворчымі дасягненнямі, бо менавіта яны складаюць аснову дабрабыту ўсёй гаспадаркі. У камунальным сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Імя Адама Міцкевіча» з такім падыходам не толькі згодны, але лічаць яго галоўным у сваёй дзейнасці. Між тым не забываюць тут і пра гістарычнае мінулае. Сёлета гаспадарка ўзялася за добраўпарадкаванне старажытнай сядзібы, вакол якой з'явіцца так званы белы парк.**

## ПАЛЕТКІ, СЯДЗІБА І БЕЛЫ ПАРК

### У гаспадарцы «Імя Адама Міцкевіча» вытворчасць спрыяе захаванню спадчыны




Дырэктар Уладзімір ПІСАРЭВІЧ.

**Кароткая візітоўка**

*КСУП «Імя Адама Міцкевіча» з 2016 года ўзначальвае Уладзімір Пісарэвіч. Пасля школы ён скончыў Пружанскі сельгастэхнікум, пасля завочна Гродзенскі аграрны ўніверсітэт. З 1988 года працаваў у гаспадарках Гродзенскай вобласці на розных пасадах. Да 2016 года быў намеснікам дырэктара па раслінаводстве ў сельгаспрадпрыемстве «Нявeравічы» Ваўкавыскага раёна. Вось ужо шэсць гадоў кіруе сельгаспрадпрыемствам у Мастоўскім раёне. Нядаўна ўзнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». Урачыстая цырымонія адбылася ў Мінску 3 лістапада.*

### Вытворчы патэнцыял

**Дырэктар сельгаспрадпрыемства Уладзімір ПІСАРЭВІЧ,** у першую чаргу, засяроджвае ўвагу на вытворчых паказчыках. Прыбытак, рэнтабельнасць — тыя катэгорыі, за якімі стаіць складаная штодзённая праца на палях, майстэрнях, жывёлагадоўчых комплексах.

— Цяпер трэба не проста працаваць, а працаваць эфектыўна, каб быў вынік, — упэўнены кіраўнік прадпрыемства. — Вытворчасць — аснова ўсяго. Мы паціху рухаемся наперад. Гэта адлюстроўваецца і ў паказчыках, і ў фінансавым стане. За дзевяць месяцаў нашаму калектыву ўдалося дабіцца нядрэнных вынікаў. Тэмп росту валавой прадукцыі склаў 113,4 працэнта.

Асноўныя віды дзейнасці — раслінаводства і жывёлагадоўля. Тут вырошчваюць зерневыя, зернебабовыя, кармавыя і масленічныя культуры, бульбу, цукровыя буракі. Займаюцца развядзеннем буйной рагатай жывёлы. За кожным відам дзейнасці — свае лічбы.

Адзін з важных паказчыкаў — ураджайнасць зерневых культур. Сёлета яна вышэйшая за леташнюю і складае 57 цэнтнераў з гектара. У бункер заклалі амаль 14 тысяч тон. Атрыманы добры ўраджай азімага рапсу, больш як на 1,5 тысячы тон, чым у мінулым годзе. Дарэчы, і плошчы пад гэту культуру ў гаспадарцы даволі значныя — 900 гектараў пры шасці тысячах гектараў агульнай пашні.

— Разам з традыцыйнымі зерневымі культурамі, такімі як пшаніца, ячмень, трыцікале, робім акцэнт і на бабовыя, у прыватнасці гарох. Бабовыя — незаменны бялок у кармленні жывёльнага статка. Зараз плошчы пад гарох невялікія — усяго 80 гектараў, але на будучы год плануем павялічыць іх больш чым утрая, — зазначае Уладзімір Пісарэвіч. — Таксама вельмі даходная культура — рапс. Займаемся цукровымі буракамі, іх ураджайнасць сёлета складае 580 цэнтнераў з гектара. Бульбы атрымана каля 1900 тон. Большую частку ўраджаю здаём на крухмальны завод, які знаходзіцца побач. За дзевяць месяцаў мы атрымалі ад рэалізацыі прадукцыі раслінаводства 6,5 мільёна рублёў. Прыбытак склаў 1 мільён 180 рублёў, што на 528 тысяч рублёў больш, чым летась. Гэта 180 працэнтаў да ўзроўню мінулага года.



Трактарыст Павел КЛІМЧУК плённа працуе гэтымі днямі на зябліве.

Значную рэнтабельнасць паказала прадукцыя жывёлагадоўлі. Ад рэалізацыі мяса тут атрымана больш за 11 млн рублёў, яшчэ 9 мільёнаў — ад продажу малака. Агульная рэнтабельнасць па гаспадарцы складае 32,5 %, што амаль на трэць больш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Сярэднямесячная зарплата вырасла на 112 % і складае 1075 рублёў.

— Кадраў у асноўным хапае, — расказвае кіраўнік. — Прыходзіць моладзь. Для спецыялістаў будуюцца дамы. У нас ёсць кватэры, вядзём рамонт жылля. Нядаўна набылі былы будынак Дома быту, рамантуем яго пад жылы дом для маладых спецыялістаў.

У гаспадарцы дапамагаюць тым сялянам, хто мае прысядзібныя ўчасткі. Гаспадарка садзіць там бульбу, праводзіць усе неабходныя апрацоўкі, дае тэхніку. Тыя, хто трымае жывёлу, забяспечваюцца сенам і саломай.






Механізатар Павел ЦЯСЛОЎСКІ мае ганаровае званне «Чалавек года». Вялікі партрэт славутага працаўніка размешчаны на фасадзе аднаго з будынкаў цэнтральнай сядзібы.

### Родам з Мастоўшчыны

#### Як працуе «Чалавек года Гродзеншчыны»

Механізатара Паўла Цяслоўскага ведаюць не толькі работнікі гаспадаркі і жыхары аграгарадка Вялікая Рагозніца. Ён, можна сказаць, вядомая асоба і ў Мастоўскім раёне, і ва ўсёй Гродзенскай вобласці. Каля трасы можна ўбачыць два банеры з яго партрэтамі і надпісам: «Чалавек года Гродзеншчыны». Павел Антонавіч жартуе, што яго сваякі і знаёмыя нават спецыяльна ездзілі паглядзець, як ён на іх выглядае. Кажа, ім спадабалася. Сам механізатар не мае нічога супраць такога фармату. Нават ганарыцца, што яму аказана такая ўвага. Робіць акцэнт на той факт, што ўрачыстая цырымонія з уручэннем дыплома і прэміі адбылася якраз у дзень яго нараджэння — 29 красавіка.

— Такі падарунак надоўга запомніцца, — кажа механізатар падчас сустрэчы на мехдвары. — Дыплом «Чалавек года Гродзеншчыны» стаў для мяне яшчэ і свайго роду талісманам, які дапамагае дабівацца большых поспехаў у працы.

Пасля заканчэння школы юнак атрымаў дакументы і сеў за баранку трактара. Цяпер вось Павел Антонавіч чацвёрты дзясятак гадоў за баранкай і трактара, і камбайна — у залежнасці ад сезона. Сёлета ўраджай асабліва радуе. Падчас уборкі зерневых намалот склаў 2600 тон. Яшчэ 1200 тон дапамог намалаціць суседняй гаспадарцы.

Вядома, маральны стымул важны, кажа механізатар. Прыемна, калі тваё імя ў ліку пераможцаў, гэта стымулюе працаваць яшчэ лепш. Разам з тым немалаважным з'яўляецца і матэрыяльнае заахвочванне. Тут улічваюцца некалькі параметраў. Класнасць, стаж... За ўборку — асобныя выплаты. Павел Антонавіч не ўтойвае, што за ўборку атрымаў шэсць тысяч рублёў. Грошы збіраецца ўкласці ў прыватызацыю бацькоўскага дома.

У ходзе размовы фарміруецца вобраз сапраўднага працаўніка ад зямлі. Усе продкі Паўла Цяслоўскага — месцічы, усе звязаны з гэтай зямлёй — і дзяды, і прадзеды. Тут працавалі і яго бацькі. «Адсюль, з Вялікай Рагозніцы, ідзе мой род», — кажа Павел Антонавіч. Земляробскую справу, як бы пафасна гэта ні гучала, працягвае і ён сам. Прычым з добрымі вынікамі як для сябе, так і для сваёй гаспадаркі. «Галоўнае, каб над галавой было мірнае неба, — кажа ён на развітанне. — Тады і праца, і жыццё — у радасць».

### Тут заквітнее парк

#### Сельгаспрадпрыемства ўзялося за рамонт старажытнай сядзібы

Першае, што ўражвае на тэрыторыі цэнтральнай сельскагаспадарчай канторы ў Рагозніцы, — вялікі прыгожы маёнтак з калонамі. Адразу паўстаюць карціны з мінулых часоў. Аказалася, будынак сапраўды старажытны. Яго яшчэ напрыканцы XVIII стагоддзя заклаў вядомы на той час дзяржаўны дзеяч Антоній Сухадольскі.

Сама сядзіба пабудавана ў стылі класіцызму з адным паверхам і порцікам на цэнтральным фасадзе. Пазней былі прыбудаваны калоны. У гаспадара ў тыя часы гасцявалі многія шляхетныя асобы. У далейшым дом-палац атрымаў у спадчыну сын, які ўдзельнічаў у паўстанні Тадэвуша Касцюшкі. Другі сын — Януарый — быў вядомым мастаком батальнага жанру, якога імператар Мікалай ІІ ангажаваў для напісання карціны. Затым палац пераходзіў да розных уладальнікаў.

Зараз сядзіба належыць КСУП «Імя Адама Міцкевіча». Будынак даволі прывабны, праўда, за савецкі перыяд тут шмат што перабудавана, але сам фасад і ўязная брама знаходзяцца ў адносна задавальняючым стане, хоць і патрабуюць рамонту. Гэтым якраз і плануюць заняцца ў сельгаспрадпрыемстве. Напрыклад, цяпер вядуцца работы па даху. Частка ўжо перакрыта. На другі год пачнецца рамонт самога фасада. Зменіцца і колер сядзібы — ён будзе падбірацца ў адпаведнасці з выявай будынка.

— Наўрад ці мы змаглі б прыступіць да рамонтных работ, каб не мелі прыбытку ад вытворчай дзейнасці, бо сродкі патрабуюцца даволі значныя, — рэзюмуе кіраўнік гаспадаркі Уладзімір Пісарэвіч. — Толькі дзякуючы рэнтабельнасці нашага сельгаспрадпрыемства ёсць магчымасць аднавіць культурную спадчыну. Няхай гэта стане яшчэ адным цікавым турыстычным аб'ектам нашай Мастоўшчыны.

А вялікі газон перад палацам плануюць пераўтварыць у белы сад-парк. Пакуль тут вядуцца работы па падрыхтоўцы для пасадкі раслін. Мяркуецца, што большасць з іх будуць мець белы колер. Над распрацоўкай ландшафту па просьбе кіраўніцтва гаспадаркі працуе дызайнер. Магчыма, першыя вынікі «белага саду» можна будзе ўбачыць ужо ўвесну.



«Старажытныя пабудовы — наша агульная спадчына, якую мы беражліва даглядаем», — кажа намеснік кіраўніка гаспадаркі па ідэалогіі Таццяна КРЭЎСКАЯ.



УНП 500056755